**Захараў, І.** Нязгасная памяць / І. Захараў // Звязда. – 1980. – 3 ліп. – С. 3.

## НЯЗГАСНАЯ ПАМЯЦЬ

Трыццаць шэсць гадоў мінула з дня вызвалення Белаурсі ад фашысцкіх акупантаў. За гэты час вырасла і ўзмужнела новае пакаленне людзей. Яны ведаюць аб тых жудасных і geраічных часах толькі па расказах старэйшых, кнігах і кінафільмах. А нам, ветэранам, чамусьці ўвесь час здаецца, што ўсё было нядаўна. І гэта растлумачыць проста. Падзеі тых грозных гадоў назаўсёды захаваліся ў нашай памяці. А хіба можна забыць сваіх таварышаў і сяброў, якія змагаліся побач і загінулі, набліжаючы перамогу?

Хто бываў у Хатыні, той не мог не звярнуць увагі на спіс назваў вёсак Верхнядзвінскага раёна, спаленых у час гітлераўскай акупацыі і не адноўленых. 258 населеных пунктаў і былы райцэнтр Асвея былі поўнасцю знішчаны. Больш чым сем тысяч мірных жыхароў гітлераўцы забілі або забралі ў рабства. Вось чаму каля 60 вёсак, жыхары якіх былі поўнасцю або амаль поўнасцю знішчаны, перасталі існаваць у гэтым азёрна-лясным кутку рэспублікі.

У даваенныя гады працаўнікі Верхнядзвіншчыны добрасумленна працавалі на палях і фермах. А калі нахлынула фашысцкая пачвара, узяліся за зброю, каб бараніць свой шчаслівы лёс.

Ужо ў жніўні сорак першага ў Асвеі дзейнічала падпольная партыйная група на чале з былым камандзірам Чырвонай Арміі Уладзімірам Сямацкім. А ў вёсцы Прошкі, што за 15 кіламетраў ад былога райцэнтра, разгарнула сваю работу падпольная камсамольская арганізацыя пад кіраўніцтвам былога рахункавода мясцовага калгаса Васіля Лукашэнкі. Неўзабаве з гэтых груп і быў створаны партызанскі атрад імя Фрунзе.

Нядоўга гаспадарылі акупанты ў нашым азёрным краі. У чэрвені 1942 года мы выгналі іх з мястэчка Каханавічы, а потым і з райцэнтра Асвея. Ужо ў жніўні былі поўнасцю ачышчаны ад гітлераўскіх захопнікаў увесь Асвейскі, большая частка Дрысенскага, Полацкага, Расонскага і Себежскага раёнаў. Да гэтага часу наш атрад перарос у брыгаду. Спачатку ў злучэнне ўваходзіла чатыры, а пазней сем атрадаў. Кожны з іх складаўся са стралковых падраздзяленняў, падрыўных груп, артбатарэі, медслужбы і гаспадарчай часці. У брыгадзе змагалася больш за дзве тысячы партызан. Мы наносілі ўдары па ворагу, дзе ён меньш за ўсё іх чакаў.

Пасля Каханавічаў захопнікі чакалі ўдару па асвейскім гарнізоне. А мы атакавалі суседні гарнізон Шкяуне, размешчаны на тэрыторыі Латвіі. У гэтай добра прадуманай аперацыі ўдзельнічаў латышскі партызанскі атрад і атрад Дубняка (Пятра Міронавіча Машэрава), з якім было загадзя ўсё дамоўлена. Напад на гарнізон з’явіўся настолькі нечаканым, што немцы і іх памагатыя не змаглі аказаць сур’ёзнага супраціўлення. Літаральна за паўгадзіны гарнізон быў знішчаны. Мы ўзялі тады вялікія трафеі. Каля сотні фурманак нагрузілі зброяй, харчамі, абмундзіраваннем, медыкаментамі.

Калі акупанты былі поўнасцю выгнаны з Асвейскага раёна, партызаны нашай брыгады разам з іншымі атрадамі і брыгадамі ўдзельнічалі ў разгроме нямецкіх гарнізонаў у Себежскім, Полацкім, Дрысенскім, Расонскім раёнах і ў Латвійскай ССР.

Аднак галоўным у нашай барацьбе з гітлераўцамі па-ранейшаму заставаліся дыверсіі на чыгунках і шашэйных дарогах. Пад канец 1942 года на рахунку брыгады было 29 падарваных і спаленых чыгуначных і шашэйных мастоў, 46 узарваных эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка.

Дыверсіі на «жалезцы» не спыняліся ні ўдзень, ні ўначы. Памятаецца такі эпізод. Група падрыўнікоў на чале з адважным партызанам Мікалаем Дзяльцовым двое сутак не магла прабрацца да чыгункі на ўчастку Бігосава – Свольна і толькі на трэція ім удалося падарваць варожы эшалон. Стомленыя падрыўнікі адыйшлі за вёску Сар'я і рашылі адпачыць у невялікім беразняку. Вартавы, пастаўлены для нагляду, паспеў даць аўтаматную чаргу, калі з кустоў вынырнулі фашысты. Дзяльцоў кінуў у карнікаў гранату і загадаў групе адыходзіць, а сам застаўся прыкрываць адыход. Перастрэлка працягвалася нядоўга. Пасля некаторага замяшання фашысты заўважылі, што вядуць бой з… адным партызанам і рашылі ўзяць яго ў палон. Патроны ў аўтаматным дыску канчаліся, Мікалай Дзяльцоў выхапіў пісталет і, адстрэльваючыся, пабег. Фашысты без стрэлаў праследавалі ўцекача. Да ручая заставалася яшчэ метраў сто. Там, на ўскрайку лесу, баявыя сябры Мікалая. Яны адкрылі б агонь тут жа. Але для гэтага яму трэба адарвацца ад фашыстаў хоць бы метраў на дваццаць-трыццаць. І раптам Дзяльцоў выхапіў з кішэні металічны партсігар і кінуў яго ў фашыстаў. Тыя імгненна падаюць на зямлю, прыняўшы партызанскую табакерку за гранату. А, калі не дачакаўшыся выбуху, пачалі страляць, па іх ударылі з аўтаматаў партызаны.

Вельмі многа клопатаў стваралі народныя мсціўцы для акупантаў. І гітлераўцы рашылі расправіцца з партызанамі. У студзені 1943 года яны пачалі карную аперацыю ў паўночна-ўсходніх раёнах Віцебскай вобласці. У ёй удзельнічалі воінскія часці, палявая жандармерыя. Карная экспедыцыя складалася з дзвюх буйных груповак.

Па ўсёй шматкіламетровай лініі нашай партызанскай зоны разгарнуліся жорсткія баі з фашыстамі, на ўзбраенні якіх былі танкі, самалёты, мінамёты, цяжкая артылерыя. Партызаны змагаліся за кожную вёску, за кожную пядзю сваёй зямлі. Нярэдка пераходзілі ў контратакі, і тады сутычка заканчвалася рукапашным боем. Партызанскі шпіталь, работу якога ўзначальваў урач Аляксандр Іосіфавіч Марачкоўскі, быў перапоўнены.

У адным з баёў мы падбілі некалькі танкаў. Адзін з іх умудрыўся адрамантаваць былы механік МТС, дзе я раней працаваў дырэктарам, Аляксандр Ангудовіч. Ён і стаў вадзіцелем машыны. І вось аднойчы (гэта было ў лютым 1943 года) гітлераўцы пайшлі ў атаку на нашы пазіцыі каля вёскі Стрэлкі. Партызаны падпусцілі іх метраў на дзвесце, а затым ударылі адразу з усіх відаў зброі. Фашысты не вытрымалі, павярнулі назад, пакідаючы на снезе дзесяткі забітых. Але праз некаторы час пасля моцнага артабстрэлу і бамбардзіроўкі яны зноў рушылі ў атаку, якая перайшла ў рукапашны бой. У самай гушчыні аказаліся нашы адважныя партызаны Пётр Пудоў, Міхаіл Агурэцкі, Сцяпан Адамёнак, Дзяніс Крупеня. Вось упаў адзін з іх, другі, трэці. Яшчэ імгненне – і нашы не вытрымаюць напружання рукапашнай сутычкі з пераўзыходзячым праціўнікам.

Імгненна ў гэты крытычны момант з лесу на гранічнай скорасці імчыцца на ворага трафейны танк. На ім паспелі ўжо намаляваць чырвоныя зоркі. Услед за танкам з крыкам «ура» беглі партызаны суседняга атрада. Фашысты ў паніцы ўцякалі з поля бою. Як пазней высветлілася, гітлераўцы прынялі гэту атаку за дэсант Чырвонай Арміі.

Ва ўсіх аружэйных майстэрнях партызаны рамантавалі трафейныя гарматы, мінамёты, аўтамашыны. Праўда, для нашай артылерыі не заўсёды хапала снарадаў. Таму выдавалі іх толькі пры крайняй неабходнасці, а стралялі, як правіла, прамой наводкай, бо прыцэльных прыстасаванняў гарматы ў большасці сваёй не мелі. Камандаваў артылерыяй былы армейскі афіцэр Міхаіл Кошалеў – цяпер генерал Савецкай Арміі.

Аднойчы (было гэта ў час карнай экспедыцыі) Кошалеву далажылі, што калона немцаў рухаецца па шашы да вёскі Задзежжа. З аднаго боку да гэтай шашы амаль ушчыльную прымыкаў лес, а з другога – поле. Кошалеў выехаў са сваёй артылерыяй на лясную прасеку, якая выходзіла на шашу, і паімчаў насустрач калоне карнікаў. З ходу партызаны развярнулі гарматы і ва ўпор расстралялі ашалелых ад такой нечаканасці гітлераўцаў. Адлегласць была настолькі малой, што Міхаіл Кошалеў з пісталета застрэліў афіцэра, які сядзеў на пярэдняй фурманцы. Падаспеўшыя да месца артылерыйскай стральбы партызаны атрада імя Арджанікідзе поўнасцю разграмілі калону.

…Баі, баі. Колькі іх было, не злічыць. Я заўжды з хваляваннем гасцюю на любай мне Верхнядзвіншчыне. На былых папялішчах і руінах – новыя дамы, школы, бальніцы, дзіцячыя яслі, бібліятэкі, палацы культуры. Жыццё працаўнікоў раёна стала яшчэ больш прыгожым і багатым. Амаль у кожным доме тэлевізар, легкавая аўтамашына, матацыкл. Я радуюся гэтаму, бо ўзнімалі вёскі з папялішчаў у асноўным былыя партызаны і франтавікі. Адразу ж пасля выгнання акупантаў мне даверылі ўзначаліць раённую партыйную арганізацыю. Многія народныя мсціўцы сталі старшынямі калгасаў, дырэктарамі саўгасаў і машынна-трактарных станцый, брыгадзірамі, паляводамі і жывёлаводамі. Напрыклад, былы начальнік разведкі атрада імя Сямацкага Міхаіл Шыпіла ўзначаліў Коханаўскую МТС, а пазней быў выбраны старшынёй калгаса «Прагрэс». Былы памочнік камандзіра гаспадарчага ўзвода таго ж атрада Ягор Мацкевіч стаў старшынёй калгаса імя Карла Маркса, пераўтворанага пазней у саўгас «Каханавічы», былы камандзір узвода гэтага ж атрада Канстанцін Мацкевіч стаў выдатным жывёлаводам.

Па існуючай традыцыі мы, былыя партызаны і франтавікі, кожны год збіраемся ля Кургана Дружбы, узведзенага на стыку трох брацкіх рэспублік – Беларусі, Латвіі і Расіі. І кожны раз, калі адпраўляюся на гэту сустрэчу, мяне ахоплівае пачуццё невыказанай радасці. У гэтым цудоўным краі лясоў і блакітных азёр мне дарага ўсё. Тут у кожнай вёсцы можна сустрэць былога партызана і амаль у кожнай вёсцы ўбачыць магілу баявых сяброў. Мы памятаем аб іх подзвігах, заўжды аддаём ім даніну павагі.

**І. Захараў,**
**палкоўнік у адстаўцы,**
**былы камандзір**
**партызанскай брыгады імя Фрунзе,**
**Герой Савецкага Саюза**